# БАБРУЙСКІЯ ДЭПУТАТЫ ПАДЗЯЛІЛІСЯ ВОПЫТАМ

## З практыкі адной выязной сесіі Магілёўскага аблсавета




**Гэтым разам месцам пераймання вопыту быў абраны Бабруйск — сёмы па колькасці насельніцтва горад у краіне. Праграма была досыць шчыльная, на парадку дня — шэраг пытанняў. Асноўныя — стан выканання на Магілёўшчыне пяцігадовай — да 2025-га — дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка», а таксама работы Бабруйскага гарсавета па павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.**

### З выездам на месца

У Бабруйску да ўдзельнікаў сесіі (у тым ліку дэпутатаў парламента і парламентарыяў) далучыліся старшыня Бабруйскага гарсавета дэпутатаў Міхаіл Жалудоў і першы намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Дзмітрый Максіменка. Удзельнікам было прапанавана падзяліцца на дзве групы, каб з выездам на месца больш дэталёва пазнаёміцца з работай асобных прадпрыемстваў і ўстаноў. Пакуль першыя знаёміліся з асаблівасцямі адукацыйнага працэсу на прыкладзе сярэдняй школы № 35 г. Бабруйска імя П. І. Батава і вывучалі магчымасці ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «БабруйскАграМаш», другія (у тым ліку і карэспандэнт «МС») наведалі дзіцячы садок № 84 Бабруйска і мэблевую вытворчасць «ФанДОК».

Дашкольная дзіцячая ўстанова знаходзіцца ў самым маладым мікрараёне горада «Маладзёжны». Ён забудоўваўся ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя. У назвах вуліц увекавечаны імёны герaічных ваенных дзеячаў, лёс якіх звязаны з горадам, — Барыса Коўзана, Сяргея Сікорскага, генерала Паўла Батава, які вызваляў Бабруйск у 1944-м.

Свае дзверы дзіцячы садок расчыніў тры гады таму. Будаваўся па дзяржзаўнай інвестпраграме Бабруйскім заводам КПД. На плошчы болей чым 2,3 тысячы квадратных метраў размясціліся ўсе неабходныя для развіцця і заняткаў дашкалят памяшканні і нават басейн. Садок наведвае 240 дзяцей, якія размеркаваныя па 13 узроставых групах. Адна з іх — спецыялізаваная, для выхаванцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення.

Прыярытэтны кірунак, які пазіцыянуе ўстанова, — фарміраванне асноў бяспечнай жыццядзейнасці. Пры падтрымцы Бабруйскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях тут абсталяваны спецыяльны пакой бяспекі. Яшчэ адзін кірунак, які распаўсюджваецца ў тым ліку і на бацькоў выхаванцаў, — патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне. Дарослыя дапамагаюць у падрыхтоўцы да свят, удзельнічаюць разам з дзецьмі ва ўрачыстых шэсцях, выставах.

**Загадчыца дзіцячага садка Таццяна АНЦЮШЭНЯ** разам са сваімі калегамі правяла экскурсію па садку і паказала, наколькі творчая праводзіцца тут работа. Вельмі кранула, як маленькія дзеці ў нацыянальных касцюмах сур'ёзна і артыстычна спявалі дарослым на роднай мове. І падобраму пазайздросціла малым, якія плёскаліся ў цёплым, вельмі сучасным і прыгожым басейне.

— У праграме будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў гэты сад тыповы, — адзначыў **дэпутат абласавета, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў Анатоль ГЛАЗ**. — Ён прадугледжвае наяўнасць усіх тых атрыбутаў, якія павінны забяспечваць паўнавартаснае выхаванне дзіцяці. Цудоўны калектыў, добра працуе. Для дзетак, якія маюць патрэбу ў індывідуальным навучанні, ёсць адпаведныя спецыялісты. Кожнае дзіця абыходзіцца бюджэту ў 4900 рублёў за год. А бацькоўская даплата складае 103 рублі ў месяц — за харчаванне, калі шматдзетная сям'я — напалову танней, а калі дзіця-інвалід, то наогул бясплатна. Трэба, каб бацькі памяталі, што наша дзяржава сацыяльна-арыентаваная, і сумленна працавалі на яе карысць.

Дарэчы, яшчэ ў садку ўсе звярнулі ўвагу, якая зручная і прыгожая тут мэбля. Высветлілася, што свайго ж вытворцы — бабруйскага прадпрыемства «ФанДОК».

Падчас візіту на яго можна было ўбачыць і іншыя ўзоры мэблі, прычым на любы густ. На жаль, санкцыі сур'ёзна паўплывалі на, лічы, горадаўтваральнае прадпрыемства Бабруйска. Яно было амаль цалкам завязана на экспарце мэблі ў цяпер не дружалюбныя краіны. Некаторыя з іх і зараз невялікімі партыямі заказваюць тут мэблю, але гэта кропля ў моры. Прадпрыемства наладжвае сувязі з усходнімі партнёрамі, павялічваюцца адгрузкі прадукцыі ў Кітай, але вельмі запаволена выходзіць з крызісу. Тым не менш прагнозы даволі аптымістычныя, і паказчыкі пакрыху, але ж паляпшаюцца. Удзельнікі сесіі наведалі таксама самы прыбытковы ўчастак на сёння гэтага вытворцы — фанерны завод. Сярэдняя зарплата на сёння тут, па словах яго кіраўніка, каля 1300 рублёў.

Сёння на «ФанДОКу» працуе 6800 чалавек. Прадпрыемства працуе разам з лесатэхнічным каледжам, які забяспечвае яго кадрамі. Сёння гэта філіял Беларускага тэхналагічнага ўніверсітэта.

**Генеральны дырэктар ААТ «ФанДОК» Андрэй ПАРЦЯНКОЎ** перакананы, што візіт дэпутатаў і парламентарыяў вельмі карысны для прадпрыемства. Нехта па-новаму адкрыў «ФанДОК», ацаніў новую лінейку яго мэблі.

— Еўропа закрыла для нас рынкі, мы пераарыентаваліся на іншыя, але яны менш маржынальныя, — канстатуе генеральны дырэктар. — Патрэбны час, перабудова, у тым ліку і па асартыменце. На жаль, працэс не вельмі хуткі.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, сувязі, жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадарцы Магілёўскага абласавета, кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Магілёў» Андрэй ЯРЦАЎ** рэзюмуе: прадпрыемства перажывае наступствы сектаральных санкцый.

— У краіне прымаюцца ўсе магчымыя меры, каб нівеліраваць сітуацыю ў галіне дрэваапрацоўкі, — адзначыў ён. — Ідзе барацьба за новыя рынкі збыту. Гэта работа і дзяржавы праз пасольствы тых краін, праз афіцыйныя візіты, і непасрэдна канцэрна «Беллесапаперапрам», у які ўваходзіць прадпрыемства. У Расіі празмернасць драўніны, але трэба шукаць нішу, больш танныя варыянты сыравіны.

### Лепш адзін раз убачыць...

Карэспандэнт «МС» пацікавілася ва ўдзельнікаў, чым асабіста ім было карысна знаёмства з патэнцыялам Бабруйска.

**Старшыням Крычаўскага і Мсціслаўскага райсаветаў Ірыне ПРУДНІКАВАЙ** і **Алене КЛЕЯНКОВАЙ** было цікава даведацца, як працуе бабруйская моладзь і ўзаемадзейнічае з мясцовай уладай. Уразіла прадпрыемства «БабруйскАграМаш», на якім атрымалася пабываць уперш ыню.

— Вельмі добрая практыка — паехаць і паглядзець, што робіцца ў раёнах, — перакананыя яны. — Можна сто разоў пачуць, але лепш адзін раз убачыць. Каб нешта прымяніць на свой раён. Захапіў узровень работы з моладдзю. На тым жа «БабруйскАграМашы» замацаванасць кадраў у 2019 годзе была ўсяго 18 %, цяпер — 40! Спрацавала тое, што была ўведзена дадатковая стаўка — спецыяліст па рабоце з моладдзю. Наогул, вопыт добры, трэба акцэнт рабіць на працоўнай моладзі. Каб яе прыцягнуць, варта стварыць неабходныя ўмовы. Мы і ў сябе ў раёнах практыкуем выязныя мерапрыемствы. Часам, нават на месцах адкрываеш для сябе шмат яшчэ няўлічаных славутасцяў і цікавых людзей.

**Старшыня Хоцімскага райсавета Яўген НІКАЛАЕНКА** таксама адзначыў дзейсную работу з моладдзю.

— Мяне вельмі ўразіла моладзь, як яны захоўваюць памяць пра Вялікую Айчынную вайну, — адзначыў ён. — Я вельмі рады за гэтых дзяцей, яны — наша надзейная будучыня. Работа па выхаванні моладзі ў Бабруйску праводзіцца сістэмная, мэтанакіраваная.

— Мы аб'ездзілі практычна кожны раён, і можна смела казаць: якая прыгожая ў нас краіна, — падзяліўся **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО**. — Бабруйск — наогул выключны горад. Мы наведалі шыкоўную вельмі сучасную школу. Я вучыўся ў звычайнай, а гэта проста фантастыка. Афармленне, напаўненне, — сапраўдны палацава-паркавы ансамбль. Знаходжанне ў такім прыгожым месцы выношае і весці сябе высокакультурна. «БабруйскАграМаш» уразіў сваёй магутнасцю і аб'ёмам. На заводзе практычна ўсе брэндзіравана. Асабіста мяне як урача парадавала, што ў месцах для курэння — інфармацыя, што гэта вялікая шкода арганізму.

— Спадабалася адладжаная сістэма ідэалагічнай работы ў сярэдняй школе № 35 імя П. І.Батава, — рэзюмаваў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ДЗЯЧЭНКА**. — Выдатная музейная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, шырокае выкарыстанне беларускай арнаменталістыкі пры афармленні холаў школы, папулярызацыя класікаў беларускай літаратуры — гэта першае, што кідаецца ў вочы кожнаму, хто пераступае парог школы, якая была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2021 годзе. Светлыя і ўтульныя класы, сучасныя спартзала, трэнажорка, басейн, бібліятэка, кабінет ратавальнікаў, сталовая з кардынальна абноўленым меню — у школе створаны вельмі камфортныя ўмовы для навучання, выхавання, адпачынку і ўмацавання здароўя дзяцей.

### Разам з жыхарамі

Падчас пленарнага пасяджэння разгледжаны ход рэалізацыі дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» з улікам сучасных патрабаванняў, падчас наведвання аб'ектаў сферы адукацыі і прамысловасці. На прыкладзе Бабруйска вывучана практыка работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У прыватнасці, якую ролю яны іграюць у прыцягненні насельніцтва для стварэння камфортнага асяроддзя пражывання і выхавання руплівых дзяцей. Калегіяльна яны дзейнічаюць у рамках ЖЭУ. У Бабруйску іх налічваецца 13. Тут працуе 81 чалавек — дэпутаты, работнікі ЖКГ, адукацыі, міліцыі, жыхары. Сюды сцякаецца ўся карысная інфармацыя, сістэматызуецца, кантралюецца. Актывісты вядуць кантроль за ўборкай прыдамавых тэрыторый, захавальнасці жылога фонду ў належным стане, прыцягваюць грамадзян да суботнікаў, заахвочваюць гараджан удзельнічаць у конкурсах і падключацца да самафінансавання цікавых для іх праектаў з удзелам абласной Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў: добраўпарадкаванне гульнявых і спартыўных пляцовак, зон адпачынку. Разам абмяркоўваюцца грамадзянскія ініцыятывы, найлепшыя з якіх фінансуюцца. Расказаў пра дзейнасць органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання **старшыня Бабруйскага гарсавета Міхаіл Жалудоў.**

**Старшыня Магілёўскага аблсавета Ірына РАІНЧЫК** назвала выязную сесію практыкаарыентаванай.

— Мы наведалі бабруйскія прадпрыемствы і сацыяльныя ўстановы з мэтай пазнаёміцца з ходам сацыяльна-эканамічнага развіцця Бабруйска, сферы адукацыі. Сістэма адукацыі ў Магілёўскай вобласці функцыянуе стабільна, рэалізоўвае права кожнага дзіця на атрыманне на годным узроўні якаснай адукацыі, духоўнага і фізічнага развіцця. Дзяржава накіроўвае значныя сродкі на стварэнне камфортных умоў для арганізацыі вучобы і вольнага часу дашкольнікаў і школьнікаў. Толькі сёлета для правядзення капітальных і бягучых рамонтаў з абласнога бюджэту было выдзелена каля 68 мільёнаў рублёў. Будуецца два новыя дзіцячыя садкі ў Магілёве і Бабруйску, дзве школы — у Магілёве і Асіповічах, завяршана рэканструкцыя дзіцячага садка ў аграгарадку Вейна Магілёўскага раёна, уведзены ў эксплуатацыю басейн «Каскад» у гарадскім пасёлку Хоцімск, адкрыты дом сямейнага тыпу ў Бабруйску. На правядзенне работ па рамонце фізкультурна-спартыўных пляцовак установы адукацыі накіравана 850 тысяч рублёў. На набыццё высокатэхналагічнага халадзільнага абсталявання — болей чым адзін мільён. Хочацца звярнуць увагу яшчэ на такі важны момант. З улікам заўваг Прэзідэнта мы павінны забяспечыць ва ўстановах адукацыі парадак і дысцыпліну. Школа закладвае падмурак не толькі будучага грамадзяніна, але і патрыёта сваёй краіны. Паўсюль павінен быць наведзены парадак у памяшканнях і на тэрыторыі. Усе работы трэба праводзіць з удзелам дзяцей. Выхоўваючы дзяцей працай, мы закладваем у іх беражлівыя адносіны да школы, імкненне прымнажаць каштоўнасці і традыцыі свайго народа. Асобная тэма — арганізацыя харчавання ў школах. У кіраўніка ўстановы павінна быць на штодзённым кантролі якасць харчавання. І трэба не забываць, што якасць навучання — гэта не толькі абноўленае абсталяванне, праграмы і падручнікі, вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, але і паспяхова ўладкаваны чалавек, яго канкурэнтаздольнасць у цяперашнім свеце і цвёрдая грамадзянская пазіцыя. Час патрабуе новых падыходаў, падрыхтоўкі кадраў з улікам неабходных для эканомікі прафесійных кампетэнцый. Паспяховае вырашэнне кадравых пытанняў непарыўна звязана з актыўным уцягваннем у працэс абучэння арганізацый — заказчыкаў кадраў. Пры наведванні прадпрыемстваў у Бабруйску мы змаглі ўбачыць, як гэта функцыянуе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**
*Бабруйск.*